Сегодня в номере: лунный календарь на 1999 год



Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

№ 7 (88). 11 — 17 лютага 1999 г. **Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік. Распаўсюджваецца ў Слоніме, Зэльве, Дзятлаве, Мастах.** Кошт свабодны

ФАШИСТЫ В МИНСКЕ ЗАМАХАЛИ КУЛАКАМИ

5 февраля, около 21.00, в Минске зверски избит членами неофашистской организации «Русское национальное единство» (РНЕ) известный белорусский политик, бывший заместитель министра иностранных дел страны Андрей Санников. Пострадали также двое активистов гражданской инициативы Хартия'97 — журналисты Дмитрий Бондаренко и Олег Бебенин.



Во время демонстрации Белорусского Народного Фронта в Минске 27 июля 1998г. группа молодых людей на проспекте Скорины вела себя вызывающе, оскорбляя участников шествия фашистским приветствием и непристойными выкриками.

На фото: боевики РНЕ нападают на мужчину-участника шествия

В тот вечер А.Санников, Д.Бондаренко и О.Бебенин направлялись в офис Хартии'97 и, увидев у входа на станцию метро «Площадь Победы» двух членов РНЕ, раздающих газеты и листовки своей организации, сделали им замечание. Вначале завязалась словесная перепалка, а затем Санников получил удар в лицо. Вслед за этим из ближайшей подворотни выскочили около пятнадцати молодых людей 16-18 лет. Завязалась драка. По словам пострадавших, действиями юнцов руководил мужчина, одетый в камуфляжную форму со стилизованной свастикой РНЕ на рукаве. Во время драки неофашисты применяли баллончики с газом, нецензурно ругались, выкрикивали оскорбления. Бебенин и Бондаренко бросились за помощью в находящуюся неподалеку Академию милиции. Однако когда помощь подоспела, нападавших на месте уже не оказалось. А.Санников был доставлен во 2-ю клиническую больницу, у него оказались сломаны нос и ребро, получено сотрясение мозга, имеются многочисленные ушибы лица и тела.

По словам Дмитрия Бондаренко и Олега Бебенина, все случилось в центре города, в людном месте, но никто из многочисленных прохожих не вмешался в происходящее. Лишь один офицер вооруженных сил сделал попытку приструнить молодчиков, но был избит. Особо подчеркнули представители Хартии, что милиция прибыла на место происшествия уже после окончания драки.Когда нападавшие скрылись, Бондаренко удалось остановить патрульную машину. Но, выслушав подробности происшествия, сотрудники милиции тотчас уехали. По мнению Дмитрия Бондаренко, в Беларуси в последние месяцы происходит активизация деятельности РНЕ. Он напомнил об уже имевших место провокациях экстремистов во время массовых акций оппозиции «Чернобыльский шлях-97 и -98», когда провокаторов, нападавших на участников демонстрации и бивших стекла в близлежащих домах, дружинники БНФ задержали и передали милиции. Однако в отношении их не были возбуждены не только уголовные, но даже административные дела, а виновных тут же отпускали из-под стражи. Более того, сказал Бондаренко, по имеющейся информации, боевики РНЕ проводят свои тренировки в спортзалах, подведомственных МВД. В связи с происшедшим, представители Хартии'97 намерены потребовать отставки министра внутренних дел В.Агольца, госсекретаря Совета безопасности В.Шеймана, начальника столичной милиции Б.Тарлецкого, из-за прямого попустительства которых происходят подобные инциденты. В конце февраля Хартия'97 готовится провести в Минске крупный антифашистский митинг, а также намерена обратиться к белорусским партиям и независимым профсоюзам с предложением создать отряды самообороны, поскольку власть не желает защитить граждан от фашизма.

Бондаренко также отметил, что юнцы с фашистской символикой, несмотря на их агрессивность, вели себя не очень уверенно и «взяли лишь числом». «Они показали себя как банда, как фашистская сволочь, вся идеология которой сводится только к тупому насилию, к установлению так называемого «русского порядка», — сказал Дмитрий Бондаренко. — Если раньше из России мы получали великую культуру, Толстого и Достоевского, то теперь — фашизм».

Геннадий БАРБАРИЧ, специально для «ГС»

P.S. Партизанский РОВД столицы возбудил уголовное дело по статье 201, часть 2 (злостное хулиганство) по факту избиения молодчиками профашистской организации Русское национальное единство (РНЕ) активистов белорусской гражданской инициативы Хартия'97.

8 февраля А.Санникову позвонил оперуполномоченный Партизанского РОВД столицы и сообщил о возбуждении уголовного дела, связав это с тем, что факт нападения получил широкую огласку в средствах массовой информации.

ЗДАРЭННІ

"Пабалдзеў"

На мінулым тыдні ў магазіне "Дружба" "пераначаваў" 13-гадовы падлетак Аляксандр П. Раніцай яго там знайшлі работнікі гандлю і перадалі міліцыі.

Начны пастаялец напхаў у кішэні пачкі цыгарэт і цукерак, але пакурыць і паласавацца салодкім не здолеў. Падлетак вучыцца ў школе-інтэрнаце горада Вілейка Мінскай вобласці, а ў Слонім прыехаў "пабалдзець". Менавіта так ён патлумачыў свой учынак работнікам міліцыі.

Мікола КАНАНОВІЧ

Абакралі на рабочым месцы

8 лютага сярод белага дня з рабочых кабінетаў медработнікаў туберкулёзнага дыспансера невядомыя ўкралі дзве футравыя жаночыя шапкі.

Вядзецца пошук злодзеяў.

Злодзеі ўцяклі на веласіпедах

Днямі з падвала дома 77/1 па Брэсцкай вуліцы прапалі 2 веласіпеды.

Няпрошаныя госці прыхапілі з сабой таксама і слоікі з кансервамі.

Злавілі на гарачым

У доме па вуліцы Чапаева супрацоўнікі слонімскай міліцыі выявілі і канфіскавалі макавую саломку.

Аматары наркатычнага зелля былі злоўленыя з доказамі.

Валянцін ЧУРЫЛА

Інцыдэнт мясцовага значэння

Увесь калектыў Зэльвенскай сельгасхіміі выступіў у абарону 29-гадовага трактарыста Мікалая Гана, якога на іх вачах бесцырымонна затрымала міліцыя.

Здарылася гэта вечарам, 26 студзеня. Пра тое, як разгортваліся падзеі таго дня карэспандэнту "ГС" расказала адна са сведкаў, якая папрасіла не называць яе імя.

— У той дзень, — як паведаміла жанчына, — каля 17 гадзін мы накіраваліся да аўтобуса, каб ехаць дамоў. Аднак убачылі на тэрыторыі міліцэйскую машыну, у якую двое міліцыянераў цягнулі Мікалая. Ён упіраўся. Але міліцыянеры дубінкай, нагамі, кулакамі актыўна яго пхалі да аўтамабіля. Мужчына ўпаў. Яго падхапілі, заламалі рукі і надзелі на іх наручнікі.

Убачыўшы гэтую дзікую валтузню, вакол машыны сабраліся людзі і пачалі абурацца дзеяннямі міліцыянераў. І сапраўды, калі чалавек у нечым і вінаваты, то навошта з ім так жорстка абыходзіцца?

Міліцыянеры зразумелі, што трапілі ў даволі нестандартную сітуацыю і па рацыі выклікалі дапамогу. Неўзабаве прыехаў яшчэ адзін нарад. Каб супакоіць публіку, міліцыянеры нічога іншага не прыдумалі, як пырскаць у людзей газам і пагражаць пісталетам. Невядома чым бы скончыўся канфлікт, калі б на месца не прыехаў начальнік пазаведамаснай аховы маёр міліцыі Віктар Дамброўскі...

На наступны дзень ён патлумачыў работнікам сельгасхіміі, якія сабраліся ў актавай зале прадпрыемства, што Мікалая Гана затрымалі па падазрэнню ў алкагольным ап'яненні. Дарэчы, каб выявіць у яго крыві ўтрыманне алкаголю, было праведзена ажно тры экспертызы. Мужчыну нават вазілі да ваўкавыскіх дактароў. Маёр таксама заявіў, што таго міліцыянера, які размахваў пісталетам, звольнілі з працы.

Карэспандэнт "ГС" спрабаваў пачуць па гэтаму інцыдэнту каментар начальніка Зэльвенскай міліцыі Сяргея Максімава. Аднак ён адмовіўся нешта сказаць, спасылаўшыся на адсутнасць часу.

Валодзя ЯНЧУК

АКТУАЛЬНО

ГРИПП НАСТУПАЕТ

Как сообщил заместитель главного врача центра гигиены и эпидемиологии Анатолий Тепин, по последним данным в Слониме и Слонимском районе болеют гриппом 73 человека, 10,2% которых составляют дети.

В то время Республиканский центр гигиены и эпидемиологии отмечает эпидемический подъем заболеваний гриппом в Беларуси.

С начала февраля гриппом переболело более 500 тысяч человек, из которых около 50% — дети.

Наиболее высокий эпидемический подъем наблюдается в Бресте, Минске и Бобруйске. Специалисты предполагают, что нынешняя эпидемия, которая пришла в Беларусь из Западной Европы, вызвана вирусом типа «А».

— Противогриппозных препаратов в аптеках имеется в достаточном количестве, — отметил Тепин, — однако, почувствовав недомогание, не следует бросаться в панику. Если врач, осмотрев вас, не нашел каких-либо осложнений, то главным лекарством в таких случаях является постельный режим, обильное теплое питье и витамины, — посоветовал врач.

По мнению столичных специалистов, эпидемия гриппа может затянуться на несколько месяцев, если в эпидемиологический процесс включится вирус другого типа.

Валентин ЧУРИЛО

СЛОНИМСКИЙ ПЕЙЗАЖ

ОБРЕЗАЛИ...

Этот пейзаж "обезглавленных" деревьев (на снимке) фотокорреспондент "ГС" Николай Супрун увидел на прошлой неделе около управления магистральных газопроводов.



Выяснилось, что таким новым методом работники названного предприятия решили омолодить деревья. Вместо того, чтобы обрезать ветки, они прошлись бензопилой по стволам, лишив деревья кроны.

На это безобразие соответственно отреагировала Слонимская инспекция по экологии и оштрафовала двух инициаторов этого мероприятия по 500 тысяч рублей каждого. Однако, как заметила инспектор по экологии Вера Гордиевская, если весной обрезанные деревья засохнут, то виновным будут выставлены финансовые санкции за ущерб.

Подождем до весны...

ПАХАВАННЕ — СПРАВА ДАРАГАЯ

Некалькі месяцаў назад я застаў свайго даўняга знаёмага дзеда Аляксандра за незвычайным заняткам. На падворку пад свой рост ён майстраваў труну. Шчыра кажучы, я вельмі здзівіўся занятку старога, бо ведаў, што яго ёсць каму хаваць.

— Дастаткова я пажыў на гэтым свеце, восьмы дзесятак пайшоў, — сказаў дзед Аляксандр. — Не ведаю, колькі часу яшчэ пражыву, таму на ўсякі выпадак раблю сабе труну. Хачу пабачыць, у якой дамавіне буду ляжаць, а потым схаваю яе пад дах, — падсумаваў стары.

Да ведама, летась у Слоніме штотыдзень у сярэднім памірала каля 10 чалавек. Пышныя пахаванні цяпер даволі рэдкая з'ява, бо заробная плата невысокая, а цэны на рытуальныя паслугі няўмольна растуць.

Яшчэ летась Гродзенскі аблвыканкам сваім рашэннем вызначыў на пахаванне нябожчыка з малазабяспечанай сям'і дапамогу — адзін мільён рублёў. Цяпер жа самая танная труна каштуе 1 млн. 991 тыс. рублёў, а з больш багатым афармленнем — 2млн. 280 тыс. рублёў. За капанне долу трэба заплаціць 800 тыс. рублёў. Кошт вянкоў са штучных кветак вагаецца ад 337 тыс. да 2 млн. 900 тыс. руб. Драўляны каталіцкі крыж каштуе 140 тысяч, праваслаўны — 173 тысячы. Жалобная стужка — 60-90 тысяч рублёў, а кошт адной напісанай на ёй літары складае 3 тысячы рублёў. Па словах начальніка службы рытуальных паслуг Івана Якімца, аўтобус-катафалк цяпер сапсаваны і не возіць нябожчыкаў на могілкі. У сярэднім, за дзень служба рытуальных паслуг прадае да 6 трунаў у дзень, а ў месяц да 50-60.

Акрамя таго, труны вырабляюць і на фабрыцы гасцінных мэблі, пухова-пер'евых вырабаў і іншых прадпрыемствах, якія маюць свае сталярныя цэхі.

Падчас гутаркі з Іванам Якімцом высветлілася, што быў намер стварыць спецыяльную брыгаду, якая б капала магілы. Меркавалася нават забараніць капаць дол іншым людзям, якіх паппрасілі родныя нябожчыка, але гэта паслуга ў Слоніме неяк не прыжылася. Тым не менш, нядаўна хавалі маю суседку. Толькі для таго, каб прыстойна апрануць нябожчыцу, родным прыйшлося заплаціць каля 20 мільёнаў рублёў. Але самым праблематычным было тое, што жанчыну не змаглі пахаваць у прызначаны час, бо не было каму выкапаць дол. У выхадныя дні брыгада службы рытуальных паслуг, што капала магілы, не працавала. Пахаванне адбылося толькі на наступны дзень.

Валянцін ЧУРЫЛА

"Малады фронт" распрамляе крылы

У Мінску адбыўся другі з'езд арганізацыі "Малады фронт". На ім прысутнічала больш за 400 чалавек. Ад Слоніма там былі сямёра юнакоў і дзяўчат.

Моладзі, якая сабралася каля 11 гадзін раніцы 7 лютага на ганку дома культуры "Сукно", аб'явілі, што ў зале, дзе павінен быў адбыцца з'езд, раптоўна прапала святло. Тым часам у фае ДК святло дэманстратыўна гарэла.

Праз некаторы час праблему з асвятленнем усё ж вырашылі.

На з'ездзе была прынята праграма дзеяння на бліжэйшыя два гады. Старшынёю зноў стаў Павел Севярынец. Дэлегат ад Слоніма Алесь Масюк быў абраны сябрам Цэнтральнай Рады "Маладога фронту".

Ганна ЧАРНЯК

ПРАБЛЕМА ВАЧАМІ МАСТАКА



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Каўбасу варыць накладна

У крамах Слоніма дэфіцытам стала вараная каўбаса.

Намеснік дырэктара Слонімскага мясакамбіната Міхаіл Белкін так патлумачыў яе адсутнасць на прылаўках: "Кошт варанай каўбасы не пакрывае затраты на яе выраб, і таму вытворчасць гэтых каўбас стратная для прадпрыемства."

Разам з тым Міхаіл Абрамавіч з гонарам адзначыў, што ў Слоніме вараная каўбаса яшчэ калі-нікалі з'яўляецца на прылаўках магазінаў, а вось у іншых гарадах яе зусім няма.

ФОТАІМГНЕННЕ



Фота Мікалая СУПРУНА

Зэльва. Прыемная сустрэча

КАНФЛІКТ

Падатковы інспектар супраць інспектараў ДАІ

На мінулым тыдні ў гадзіну ночы супрацоўнікамі Мастоўскага ДАІ за кіраванне машынаю ў нецвярозым стане быў затрыманы інспектар падатковай інспекцыі Юрый Цылюлька.

На яго быў складзены пратакол. Інспектар з дзеяннямі работнікаў міліцыі не пагадзіўся і пачаў адстойваць свае правы. А менавіта, стаў пужаць міліцыянераў, што ў хуткім часе пяройдзе працаваць у пракуратуру... і тады з імі разбярэцца. Калі запалохаць не ўдалося, тады ён знайшоў "добрага дзядзьку" у раённым кіраўніцтве і праз яго паспрабаваў уздзейнічаць на супрацоўнікаў ДАІ. Гэта таксама не дало ніякіх вынікаў. ДАІ пазбавіла Цылюліка шаферскіх правоў тэрмінам на 30 месяцаў. Падатковы інспектар накіраваў скаргу ў абласное ДАІ.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЧЫМ БУДУЦЬ НАКОРМЛЕНЫ ДЗЕТКІ?

Год назад у нашай рэспубліцы была зацверджана праграма "Дзеці Беларусі", дзе ёсць раздзел "Індустрыя развіцця дзіцячага харчавання". Аднак яно ў крамах Слоніма амаль знікла. Чаму?

З гэтым пытаннем карэспандэнт "ГС" звярнуўся да загадчыцы слонімскай малочнай кухні Таццяны Апарынай.

— Сухія сумесі выпрабляе адзінае ў рэспубліцы ваўкавыскае прадпрыемства "Беллакт". Цяпер там узнікла шмат праблем. Тым не менш, адзін пачак дзіцячага харчавання сёння каштуе каля 74 тысяч рублёў, што на 30 працэнтаў ніжэй сабекошту. Таму шмат яго вывозіцца за межы Беларусі. А ў апошнія месяцы на прадпрыемстве "Беллакт" узнікла яшчэ і праблема з упаковачным матэрыялам.

— Значыць, і на слонімскай малочнай кухні ёсць праблемы з сухім дзіцячым харчаваннем?

— Сур'ёзных праблем пакуль няма. Нядаўна мы атрымалі "Малютку" і "Малыш", а астатнія стравы рыхтуем самі з натуральных прадуктаў. Адзіную цяжкасць складае тое, што "Беллакт" і іншыя прадпрыемствы патрабуюць папярэднюю аплату, а з фінансамі ў нас, як і ва ўсіх сёння, цяжкавата.

— Таццяна Іванаўна, колькі дзяцей за месяц абслугоўвае слонімская малочная кухня?

— Кожны месяц па-рознаму. У студзені мы абслугоўвалі 108 дзяцей. З іх — 45 з сельскай мясцовасці. Дарэчы, дзеці з шматдзетных сем'яў карыстаюцца харчаваннем бясплатна.

— А ў якую суму абыходзіцца ўвесь яго набор?

— Калі бацькі бяруць харчаванне для свайго дзіцяці з нашай кухні ў поўным аб'ёме, а гэта дзесьці дзесяць назваў страў, то павінны заплаціць у месяц 1 мільён 660 тысяч рублёў. Але можна для немаўляці ў нас купляць толькі некаторыя віды прадуктаў, што будзе значна танней.

— Дзе бяруць дзіцячыя сумесі тыя бацькі, хто не жадае карыстацца паслугамі вашай кухні?

— Хто дзе. Хто ў Мінску, хто ў Гродне, хто ў фірменным магазіне "Беллакт" у Ваўкавыску, а хто і за мяжою. У залежнасці, на колькі матэрыяльна забяспечана сям'я. Тым не менш, скажу, што слонімская дзіцячая кухня робіць усё магчымае, каб дзеткі своечасова атрымлівалі якаснае і смачнае харчаванне.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

Музыка гучыць

Сёння ў Зэльвенскай дзіцячай музычнай школе вучацца 225 дзяцей.

Дырэктар школы Уладзімір Сарокін адзначыў, што пяць яго выхаванцаў, пасля атрымання сярэдняй музычнай адукацыі цяпер самі працуюць настаўнікамі музыкі. А Аляксандр Сяменчык на рэспубліканскім конкурсе "Новыя імёны" стаў лаўрэатам у намінацыі метадычных і творчых работнікаў.

"Іграй, гармонік!"

Пад такой назвай у Зэльве прайшоў конкурс сярод самадзейных музыкаў.

Удзел прынялі каля дваццаці гарманістаў і баяністаў. Сярод дарослых перамагла гарманістка баба Вера Латош.

Антон РАЧОК

Такі прафсаюз — не абаронца

Работнікі ўчастка міжгародняй сувязі Мастоўскага вузла электрасувязі падалі заявы аб выхадзе са складу афіцыйнага прафсаюза.

Пайсці на такі крок іх прымусіла бяздзейнасць гэтай арганізацыі пры адстойванні іх інтарэсаў.

Іван МІЛАСНІЦКІ

Комитет готовится к весне

Республиканский забастовочный комитет запланировал провести общереспубликанскую забастовку весной этого года.

Предполагается, что наряду с экономическими, будет выдвинуто и политическое требование — отставка президента Александра Лукашенко.

БелаПАН

ЗДАРЭННІ

Кабеты пайшлі ў рукапашную

У вёсцы Старына Дзятлаўскага раёна пабіліся сялянкі А. і М.

Пакінуўшы "поле бітвы", яны абедзве пабеглі скардзіцца ў міліцыю. Кожная з іх лічыць сябе пацярпелай.

Злодзей не спіць

У адну з хат вёскі Ведравічы Дзятлаўскага раёна, дзе зімой ніхто не жыве, залезлі невядомыя і вынеслі самыя каштоўныя рэчы.

Страту выявіла дачка гаспадыні, якая прыехала з Навагрудка праведаць родную сядзібу. Вядзецца следства.

Бацька — на дачку

Жыхар г.п.Наваельня Дзятлаўскага раёна К., будучы п'яным, учыніў дома скандал.

У парыве гневу ён ударыў бутэлькай па галаве сваю родную дачку.

Цяпер і камбікорм у цане

Жыхар г.п.Наваельня Дзятлаўскага раёна Б. на падворку свайго дома пакінуў на ноч 8 мяхоў камбікорму і веласіпед.

Прачнуўшыся раніцай, ён не ўбачыў ні таго, ні другога. Злодзей устаноўлены.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Агонь прыносіць страты

У жыхара вёскі Меляхавічы Зэльвенскага раёна Івана Жука згарэла хата.

Страты склалі 45 мільёнаў рублёў.

Антон РАЧОК

У старшыні згарэў "Форд"

Днямі падчас прагрэву рухавіка загарэўся аўтамабіль "Форд-Скорпіо", які належаў старшыні мастоўскага калгаса "Зара" М.Каранцу.

Агонь знішчыў машыну цалкам, і рамантаваць не было чаго.

Антон МАКЕЙ

НАДВОР'Е



11 февраля преимущественно без осадков, ветер неустойчивый 4-9 м/с, температура воздуха ночью -12, -17 при прояснениях до -22, днем -9, -14 градусов.

Газета Слонімская. Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г. Юрыдычны адрас: г.Слонім, Брэсцкая,109/12. Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас для пісем: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5. Тэл. 2-14-39. (017)210-87-17 E-MAIL:gs@irex.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 10 лютага 1999г. Час падпісання 8:00. Надрукавана ў Баранавіцкай узбуйненай друкарні, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

Падпісны індэкс 64042. Наклад 7.200 экз. Заказ № 352

АКТУАЛЬНО

СКОРО НАС ПЕРЕПИШУТ

Как известно, с 16 по 23 февраля в Беларуси пройдет перепись населения.

За прошедшее после последней переписи десятилетие в жизни республики произошли значительные демографические и социальные изменения. Например, в период с 1988-го по 1998 год в республику иммигрировало примерно 687 тысяч человек, эмигрировало – около 680 тысяч. За этот же период умерло примерно 1 миллион 200 тысяч и родилось около 1 миллиона 60 тысяч человек.

Для проведения переписи подготовлено 11 миллионов переписных бланков, отпечатанных на русском языке и около 2 миллионов бланков на белорусском языке. Такой объем белорусскоязычного тиража переписных бланков определен на основе изучения итогов прошлой переписи и данных социсследований. Граждане страны, менее года проживающие за ее пределами, будут внесены в переписные листы по итогам опросов их родственников. Каждый из 41 тысячи участников переписи должен иметь при себе удостоверение с гербовой печатью и черный портфель с символикой переписи, а также паспорт, позволяющий установить его личность.


Николая СУПРУ

Евгения ПЛОТНИКОВА

– Главная цель переписи, – говорит начальник Мостовского отдела статистики и анализа Евгения Плотникова, – определение общего количества жителей на конкретной территории. На основе этих данных определяется перспектива социально-экономического развития как отдельных регионов, так и Беларуси в целом.

Перепись населения в соответствии с рекомендациями ООН проводится практически всеми странами мира через каждые 10 лет. Переписи дают уникальную комплексную информацию о количестве и составе населения по полу, возрасту, национальности, языку, уровню образования, семейному положению, занятости, жилищным условиям и другим характеристикам.

Время проведения переписи выбирается в период наименьшей миграции населения. Для Беларуси таким периодом являются зимние месяцы: середина января и середина февраля.

Подбор людей, которые будут заниматься переписью проводится из числа работников предприятий и организаций независимо от формы собственности, студентов учебных заведений.

Иосиф ПОЛУБЯТКО

СПОРТ

Кубак вобласці паехаў у Гродна

5–7 лютага ў слонімскім спарткомплексе праходзілі гульні Кубка вобласці па міні-футболу сярод калектываў фізкультуры.

У спаборніцтве ўдзельнічалі лепшыя каманды Гродзеншчыны па выніках мінулага года. Яны прадстаўлялі Ваўкавыск, Зэльву, Казлоўшчыну, Масты, Гродна. Ад Слонімшчыны за Кубак вобласці выступалі тры каманды.

Слонімскае "Дынама", якое ў сваёй групе заняло першае месца, у паўфінале сустракалася з гродзенскім "Сельгасінстытутам" і ва ўпартай барацьбе прайграла. Уладальнікамі Кубка вобласці сталі гродзенцы. У фінале "Сельгасінстытут" гуляў з мастоўскай камандай. Пасля першага тайма лік быў нічыйны — 2:2, у другой палове гульні гродзенцы забілі тры мячы і перамаглі. Лепшым нападаючым турніра быў названы футбаліст слонімскага "Дынама" Дзмітрый Аначэнка.

Алег ТАЧОНЫ

НАВІНЫ

Тэатральная выстава

У Слонімскім краязнаўчым музеі адкрылася тэатральная выстава. Яна прысвечана пасляваеннаму тэатральнаму жыццю нашага горада.

Сярод экспанатаў выставы: афішы, касцюмы герояў спектакляў, праграмкі, фотаздымкі і г.д.

Цяпер у нашым горадзе існуе дзяржаўны беларускі драматычны тэатр, якому 1 студзеня 2000 года споўніцца дзесяць гадоў, а ўвогуле, тэатральнаму мастацтву Слонімшчыны больш за 200 гадоў.

Сяргей ЧЫГРЫН

"Поглотит" ли Россия Беларусь?

Даже наиболее просвещенные российские сторонники сближения России и Беларуси имеют в виду «фактически поглощение» последней. А «непросвещенные» — еще и смещение Лукашенко.

Так считает известный российский политолог, член Президентского совета РФ, заместитель директора Института Европы Российской академии наук Сергей Караганов. Именно поэтому, считает он, после 1997 года Александр Лукашенко и белорусская политическая элита «испугались» сближения двух стран.

Последний всплеск интеграционной активности, выразившийся в подписании в декабре 1998 года документов о дальнейшем единении двух стран, С.Караганов объясняет стремлением ельцинского окружения таким образом «загладить историческую вину» президента за Беловежскую пущу. Кроме того, ученый допускает, что готовится создание нового поста для Бориса Ельцина – главы объединенного российско-белорусского государства – в случае досрочного сложения им полномочий президента России. Что же касается политических перспектив белорусского лидера, то Караганов считает, что «ни при каком раскладе фактически до 2004 года Лукашенко не получит широкого выхода на российскую политическую сцену». По мнению российского аналитика, Беларуси в будущем объединенном государстве должны быть предоставлены «некие особые права, преимущества». Если же сближение «будет прекращено – привилегии обрушатся, и Беларусь попадет в гораздо большую нищету», ибо «экономическое «перекрытие» со стороны России означает смерть для Беларуси», – предрекает Сергей Караганов.

БелаПАН

ИНТЕРЕСНЫЙ СОБЕСЕДНИК

ОН СЛУЖИЛ НА БАЙКОНУРЕ

Слонимчанин Николай никогда не думал, что в свое время целых полтора года его жизни будут связаны с космосом. А случилось это 20 лет назад: когда его призвали в армию. Вначале он попал в учебное подразделение, которое находилось в Псковской области. Около шести месяцев его обучали по специальности "техник по ремонту механического оборудования". Проще говоря, изучал ракеты. К концу "учебки" Николай прошел медико-психологическую комиссию. Во время ее прохождения было все: работа на специальном пульте, испытания на центрифуге, когда, вращаясь в разных плоскостях, приходилось еще и задачки решать...

– Я на всю жизнь запомнил одну из них: "Когда вы сомневаетесь в том, что есть птицы, которые летят быстрее реактивного самолета, то зачеркните кружочек, если "нет" – зачеркните квадрат", – вспоминает Николай.

Через некоторое время комиссия отобрала из 40 курсантов 9, в том числе и его. Эту группу ночью посадили в поезд и везли трое суток в неизвестном направлении. Наконец, снова ночью всех высадили на какой-то маленькой безлюдной станции и посадили в крытую автомашину. Во время движения пять или шесть раз их останавливали и внимательно проверяли документы. Только под утро прибыли на место.


– Всех по очереди вызывали для собеседования в штаб, – вспоминает Николай. – Седой полковник, помню, спросил у меня: "Расскажи, сынок, чему тебя учили". Когда я закончил говорить, офицер с усмешкой сообщил, что такие типы ракет, которые мы изучали, стали уже историей, и нам придется осваивать совершенно новые образцы...

Так мы узнали, что попали на Байконур. Вскоре увидели, что это огромный полигон, где размещаются космические объекты. – В то время на Байконуре были две стартовые площадки, – говорит Николай, – "двойка", или, как ее называли, "гагаринский старт" и 31-ая площадка. На одной из них мне и пришлось служить.

В ходе нашего разговора я узнал, что за время службы нашего земляка в небо пошло 4 искусственных спутника земли, те самые "Космосы", про которые кратко говорили по радио и телевидению. По словам Николая, об их запуске они узнавали за 3-4 дня до старта. Но больше всего ему запомнилась "дембельская работа" – подготовка к старту "Союза-9" с космонавтами Николаевым и Севостьяновым на борту. Оказывается, космонавтов он видел часто: Елисеева, Терешкову, тот же экипаж "Союза-9". Понятно, что никаких особых разговоров между солдатами и космонавтами не было и не могло быть, а вот автографы они давали охотно.

– Вот только Терешкова никому никогда автографов не давала, – отмечает мой собеседник. – Может потому, что ей было не до автографов? Она ведь проводила в космос своего мужа – Николаева...

По словам Николая, телевидение так монтировало репортажи о стартах космических кораблей, что у людей складывалось впечатление: вот поднялись космонавты в отсек ракеты, сели и полетели. А это далеко не так! Космонавты садятся в ракету еще до ее заправки, которая длится



порой более двух часов. И все это время они поддерживали связь, адаптировались к своему будущему жилищу...

Больше всего впечатлял старт ракеты. Обычно перед пуском все работники и военные покидали зону старта, т. е. "эвакуировались" в степь. Только один раз Николаю повезло, и он остался в монтажном корпусе, который находился приблизительно в пятистах метрах от стартовой площадки. В тот день с высоты пятого этажа он наблюдал фантастическое зрелище: внезапно возник столб огня и дыма, земля буквально начала дрожать. Так ракета преодолевала земное притяжение.

Я спросил у Николая про нештатные ситуации, которые, возможно, возникали во время его службы. На это он ответил следующее:

– Конечно, они были. Однажды нужно было выгрузить с платформы искусственный спутник земли – шарик диаметром около двух метров, а крановщика почему-то не было. Пришлось мне сесть за рычаги крана, времени было в обрез.

Это и была его внештатная ситуация, за которую он назавтра получил два наряда вне очереди на кухню. "А вообще, все было подчинено дисциплине, – рассказывает Николай. – Тогда было строго запрещено иметь фотоаппарат, делать рисунки с натуры. Поэтому, как память о службе, я не имею "дембельского альбома". Особый отдел работал оперативно: проверяли все, в том числе и письма. О том, что служу на Байконуре, писать домой было запрещено. Даже когда уволился в запас, никому, кроме родителей, не рассказывал где служил... Попасть в отпуск, служа на космодроме, было практически невозможно. Не знал я, что такое увольнительная в выходной день. А куда было идти? В степь тушканчиков ловить?.. До ближайшего города было 70 километров...

Рядом с нами, военнослужащими, на космодроме работало много людей в штатском. Звали мы их просто: "дядя Саша", "дядя Витя". В основном это были крупнейшие ученые и конструкторы, а также большие чины из Кремля. Но команду о прекращении работы все выполняли точно и одновременно. Ее передавали через громкоговорители, например, во время пролета над Байконуром американского спутника".

По словам Николая, фамилии некоторых космонавтов, оказывается, были изменены по требованию высокопоставленных лиц из Москвы. Например, фамилию польского космонавта Хермашевского изменили на Гермашевский, т. к. она "не звучала". Еще больше изменили фамилию болгарского первопроходца космоса. По деду и отцу он всегда был Какаловым, а сделали его Ивановым. С такой фамилией он и полетел к звездам... После приказали монгольскому дублеру переделать свою фамилию на Ганзорик. До этого он был всю жизнь Ганзорхуяк.

Беседовал Валентин ЧУРИЛО

P.S. *В связи с тем, что у Николая не закончилась подписка о неразглашении некоторых моментов службы, мы не называем его фамилии и не публикуем снимок.*

УВАГА! КОНКУРС "ШТО Б ГЭТА ЗНАЧЫЛА?" ад "Kodak-Люкс"

Шаноўныя чытачы!

Конкурс "Што б гэта значыла?" працягваецца. Рэдакцыя атрымлівае ад вас шмат подпісаў да здымкаў, але выбірае да друку самыя лепшыя. Сёння мы публікуем подпісы да здымка, які быў надрукаваны ў пятым нумары "ГС".



Ніжэй друкуем новае фота нашага карэспандэнта Мікалая Супруна. На працягу дзесяці дзён чакаем ад вас да яго смешныя подпісы. Не забывайце ўказваць сваё імя, прозвішча, дамашні адрас і тэлефон.

Рэдакцыя чакае ад вас і цікавыя фотаздымкі на гэты конкурс. Аўтары самых удалых подпісаў і фотаздымкаў атрымаюць прызы ад слонімскага філіяла фірмы "Кодак-Люкс", які з'яўляецца спонсарам нашага конкурсу, таму жадаем вам больш гумару!

***

Так лятаў бы і лятаў,
Аж пакуль старым не стаў,
Але ж нешта трэба есці,
Дзе б каму на шыю сесці?

Аляксандр Казлоўскі

***

Пацаны, пацаны,
Вы держите штаны,
Вы держите штанишки,
мальчишки!

***

Неприятность эту
мы переживем.

Ирина Беглик

***

Это он, это он —
Наш дворовый чемпион,
Соколом взлетает ввысь,
Эй, ребята, берегись!

Татьяна Лысуха

***

Хоць акрабатам я не стану--
Да першай шыі ўсё ж дастану.

Святлана Болцік

***

Ну, народ, трымайся,
Плечы падстаўляй.
Больш не вытыркайся,
Нос не задзірай.

***

Гніце спіны, мужыкі, —
Век такі і час такі.

Таццяна Тарасік

***

Из друзей и родных
Я "слона" соорудил.
Не боится ничего,
Даже веса моего.

Александр Радюкевич

***

Став буквой "зю"
и голову спрятав,
Спасались от бомбы
мои друзья.
Взрыва не будет —
не бойтесь, ребята,
Это не бомба —
всего лишь я.

***

Игра проста.
В нее легко играется —
Названье помни —
только и всего.
Девизом мушкетеров
называется:
"Один на всех, а все
— под одного!"

Светлана Козлова

***

Держитесь, парни, крепче,
Чтоб не было увечья.

Людмила Новик

***

— А чаго ж захацелася яму?
— Арлом звацца.

Лілія Пруднікава

Нам в столовой манку дали —
От нее мы все устали.
А ему горох достался —
От земли он оторвался.

Денис Присняк

***

Лечу и вспоминаю прошлое,
Пора давно уже решать:
Конечно, парни все хорошие...
Кому же спину поломать?

***

Погода полета —
самая лучшая,
И буду не скоро я на земле.
Интересно мне все же,
Сколько горючего
Осталось за время
полета во мне?

Лариса Козлова

***

Ножку правую вперед,
А потом ее назад.
Потанцуем буги-вуги,
Не попадать бы с натуги.

Наталья Эгерд

***

Что за чудо, что за диво —
Очередь стоит красиво.
Я лазеечку найду —
Первым в магазин войду.

Наталья Бошко

***

По утрам вместо разминки
Поскачу-ка я по спинкам.

Юрий Яговдик

***

Раз, два, три, четыре, пять —
Пора тормоз мне включать.

Сергей Паценко

***

Подождите, я сейчас,
Подвезите на Парнас.
Я б пошел туда пешком —
Только ездят там верхом.

Надежда Добриян

***

У кого нет коня,
Тот садись на меня.

Валентина Корнева

***

Хоть в полете я гляжусь, только чем вот приземлюсь?

Виктор Новоселов



Фота Мікалая СУПРУНА

Што б гэта значыла? (№7)

СВЕТЛЯЧОК

ДУМАЙ, СООБРАЖАЙ!

Вот мы решаем задачу у доски и не можем решить. Учитель говорит: "Ну, думай, думай, соображай!". А что значит думать? Что именно надо делать? Вот мы стоим и соображаем, но никто в целом мире не сказал бы, думаем ли мы в этот момент или мечтаем о мороженном, а если думаем, то правильно или неправильно. А если неправильно, то в чем именно мы ошибаемся. Никто не может влезть к нам в голову и наблюдать происходящее в ней. Вот поэтому все неприятности в школе, все нежелание учиться, все плохие отметки большей частью оттого, что мы или не умеем думать или чаще не хотим, потому что думать — тяжело.

Вот почему научить думать — самая трудная задача учителя, научиться думать — самая трудная задача ученика.

ХИТРЫЕ ЗАГАДКИ

1. Вы зашли в тесную комнату. В ней есть две лампы — керосиновая и газовая. Что вы зажжете в первую очередь?
2. Можно ли в решете воду переносить?
3. За чем вода в стакане?
4. От чего утка плавает?
5. По чему птица летает?

КРОССВОРД

(по вертикали: Р О С С В О Р Д)

1. Зверек, живущий под землей. 2. То, где плавает лодка. 3. Насекомое. 4. Друг человека. 5. Птица, охотящаяся ночью. 6. Хищный зверь. 7. Крик. 8. Что носят олени на голове. 9. Кто лечит людей?

1
2
3
4
5
6
7
8
9

За мінулы тыдзень у Слонімскім аддзеле ЗАГСа зарэгістраваны дзеткі, якія нядаўна нарадзіліся:

Давыдзенка Сяргей
Жук Анастасія
Турук Ангеліна
Некрашэвіч Алена
Ціханові́ч Уладзіслава

За мінулы тыдзень у Слонімскім аддзеле ЗАГСа зарэгістраваны шлюбы:

Кавалеўская Валянціна і Маляўка Аляксандр
Пярова Ірына і Герасімчык Аляксандр
Дэйка Кацярына і Чарнуха Сяргей
Савіч Алена і Бірук Уладзімір
Пясляк Ірына і Снігір Аляксандр
Карповіч Людміла і Пракопіч Вячаслаў
Лебедзева Вольга і Галубец Аляксандр
Майсейчык Наталля і Пасынкаў Дзяніс

СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ

Шлёмен Мікалай Віктаравіч	1960 г.н.
Баранава Людміла Валер'еўна	1970 г.н.
Навумчык Наталля Вацлаваўна	1961 г.н.
Анісімовіч Вольга Канстанцінаўна	1925 г.н.
Чарнуха Соф'я Аляксандраўна	1942 г.н.
Зыкін Анатоль Іванавіч	1938 г.н.
Дэйка Міхаіл Афанасьевіч	1935 г.н.
Шапель Анатоль Уладзіміравіч	1953 г.н.
Валюк Іван Ксенафонтавіч	1904 г.н.
Каспяровіч Мар'ян Іосіфавіч	1946 г.н.
Бадунова Варвара Цімафееўна	1915 г.н.
Хілімончык Сцефаніда Сцяпанаўна	1921 г.н.

Вучні 5-га класа Сянькоўшчынскай СШ і іх бацькі выказваюць глыбокае спачуванне класнаму кіраўніку **Прудніковай** Лілії Міхайлаўне з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці **бацькі**.

АНЕКДОТЫ

☺ Под окнами родильного дома.
- Рост какой?
- 51 сантиметр.
- Какой вес?
- 4.400!
- На кого похож?
- Ты его не знаешь.

☺ - Когда я выйду на пенсию, то не буду абсолютно ничего делать. В течение первых месяцев я буду сидеть в кресле-качалке.
- А потом?
- А потом начну качаться.

☺ - Почему ты такой грустный?
- Завтра выдают замуж мою невесту.
- Как! За кого?
- За меня...

☺ - Умоляю тебя, доченька, не выходи за этого человека!
- Но, мамочка, я ненадолго...


☺ - Рустам спас девушку, которая тонула, а вскоре на ней женился.
- Он счастлив?
- Не знаю. Только теперь и близко к воде не подходит.

☺ Сосед стучится в дверь:
- Привет. Мы купили новую машину. Не одолжишь немного хлеба?

☺ Жена:
- А, правда, что все грызуны глупые и прожорливые?
Муж:
- Правда-правда, мышка моя.

КРОССВОРД

от Владимира Вашуты



ПО ВЕРТИКАЛИ:

1. Город в Японии. **2**. Русский поэт 20 века. **3**. Стеклянный сосуд для химических работ. **4**. Река в Колумбии. **6**. Часть света. **9**. Горная система в Евразии. **11**. Рыба семейства лососевых. **14**. Зодиакальное созвездие. **15**. Южноамериканская хищная рыба. **17**. Имя няни А.С. Пушкина. **18**. Корабль, на котором О.Коцебу совершил кругосветное плавание в 1815-1818г.г. **20**. Цирковой артист. **21**. Каменный утес. **24**. Государство в Южной Америке. **26**. Дорожка для спортивных состязаний. **29**. Местный ветер на берегу моря, озера. **30**. Палуба от боевой до кормовой рубки. **31**. Ряд арок, опирающихся на столбы или колонны. **34**. Толстая жердь. **35**. Город-курорт в Краснодарском крае.

ПО ГОРИЗОНТАЛИ:

5. Группа животных одного вида. **7**. Домашняя птица. **8**. Стационарный подъемник. **10**. Площадка в цирке. **12**. Спортивный судья. **13**. Одноместное спортивное судно. **16**. Старинная немецкая монета. **19**. Государственное денежное пособие. **20**. Комната для занятий в школе. **22**. Русский естествоиспытатель-дарвинист, профессор. **23**. Сумка, перевязь с гнездами для ружейных патронов. **25**. Зимняя спортивная площадка. **27**. Болотистая местность, поросшая мелким лесом. **28**. Сигнал тревоги. **32**. В древнеегипетской мифологии: сказочная птица, сжигающая себя и вновь возрождающаяся из пепла. **33**. Взрывчатое вещество. **34**. Хвойное дерево. **36**. Советский пловец, бронзовый призер 20 Олимпийских игр. **37**. Горная система в Южной Америке. **38**. Бег, аллюр, при котором лошадь идет вскачь.

ОТВЕТЫ НА КРОССВОРД (№6)

ПО ГОРИЗОНТАЛИ: 1. Устав. **6**. Сепаратор. **9**. Фасад. **10**. Рикошет. **14**. Небосклон. **15**. Фолиант. **19**. Предок. **20**. Заговор. **21**. Дума. **24**. Овин. **25**. Блокнот. **26**. Восток. **29**. Балласт. **30**. Завещание. **32**. Галерея. **33**. Осока. **35**. Викторина. **36**. Брань.

